СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 СТУДЗЕНЯ 2018 г. АЎТОРАК № 5 (28621)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Горкі досвед земляка-мігранта

Сфатаграфаваць… Першую сусветную

СТАР. 13

Лес Кузьмы Чорнага

СТАР. 15

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:

Зарплата ў гэтым годзе ў бюджэтнай сферы будзе залежаць ад работы эканомікі, ад таго, як спрацуе рэальны сектар. У планах — рост тарыфнай стаўкі першага разраду. Плануецца падняць яе двойчы. У якім памеры — будзе залежаць ад таго, як спрацуе эканоміка. Сёлета ў краіне плануецца ўдасканаліць сістэму аплаты працы ў бюджэтнай сферы. У цяперашнім выглядзе яна існуе некалькі дзясяткаў гадоў. Стаіць задача перагледзець яе за 2018 год. Плануем перайсці ад тарыфнай стаўкі першага разраду да базавай стаўкі. Пры гэтым базавая стаўка будзе раўняцца бюджэту пражытачнага мінімуму. Гэта дазволіць спрасціць сістэму аплаты працы.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.01.2018 г.

Долар ЗША		1,9974 ▲
Еўра		2,3951 ▼
Рас. руб.		0,0349 ▲
Укр. грыўня		0,0707 ▲

ISSN 1990 - 763X

З ВЕРАЙ, НАДЗЕЯЙ, ЛЮБОЎЮ

Фота БЕЛТА.

У нас ёсць усё для таго, каб палепшыць сваё жыццё

Склалася ўжо добрая традыцыя, па якой у вялікія хрысціянскія святы кіраўнік нашай краіны наведвае праваслаўны храм. Не стала выключэннем і сёлетняе Раство Хрыстова — у гэты дзень Аляксандр Лукашэнка запаліў калядную свечку каля Мінскай іконы Божай Маці ў Свята-Духавым кафедральным саборы.

Кіраўніка дзяржавы сустрэў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. У храме таксама прысутнічалі прадстаўнікі праваслаўных брацтваў і сястрыцтваў, навучэнцы нядзельнай школы, прыхаджане, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што такія духоўныя святы, як Раство Хрыстова або Вялікдзень, святкуе ўвесь народ. «Гэтыя святы — дні натхнення і натхнення ўсяго народа», — сказаў Прэзідэнт. Ён асабліва адзначыў, што іх у розныя дні адзначаюць усе незалежна ад веравызнання. «І гэта вельмі вялікае наша дасягненне, што нашы людзі гэтае свята святкуюць усе, нягледзячы на тое, што належаць да іншых канфесій. Таму што яны належаць толькі адной нашай краіне, гэтаму кавалку зямлі, імя якому — Беларусь», — дадаў беларускі лідар.

СТАР. 2

СПРАДВЕЧНАЯ НАВУКА

Фота БЕЛТА.

Сёння адбудзецца ўрачыстае ўручэнне прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва 2017 года. Атрымліваць спецпрэмію прыедуць і прадстаўнікі калектыву Акцябрскага раённага дома рамёстваў. Узнагарода прысуджана ім за значны ўклад у захаванне і папулярызацыю традыцыйных ткацкіх рамёстваў, актыўную выставачную дзейнасць. Навучаюць у Акцябрскім і іншым традыцыйным рамёствам.

На здымку: метадыст-майстар па ганчарстве Ірына ДАБРАНСКАЯ праводзіць майстар-клас.

■ Па выніках года

НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПАДАЦЬ ПАДАТКОВУЮ ДЭКЛАРАЦЫЮ

А вось даходы ад продажу «дзядулевай» нерухомасці падаткам не абкладаюцца

Сёлета не пазней 1 сакавіка трэба падаць у падатковыя органы дэкларацыю аб даходах за мінулы год. Тут варта адразу адзначыць, што далёка не ўсе абавязаны наведваць падатковую інспекцыю. Па-першае, дэкларацыі запаўняюць толькі падатковыя рэзідэнты нашай краіны. А гэта фізічныя асобы, якія фактычна знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі больш за 183 дні ў каляндарным годзе. Па-другое, у часткі плацельшчыкаў існуе толькі права падаць такую дэкларацыю, каб потым атрымаць падатковы вылік. Але ёсць і тыя, хто павінен абавязкова запаўняць падатковую дэкларацыю. Менавіта для іх «Звязда» сумесна са спецыялістамі Міністэрства па падатках і зборах (МПЗ) Беларусі падрыхтавала падрабязны тлумачальнік.

Грузавік, аўтобус ці другі «легкавік»

Да вясны абавязкова падаць дэкларацыю павінны тыя, хто за мінулы год прадаў больш як адзін аўтамабіль, тэхнічна дапушчальная агульная маса якога не перавышае 3500 кг і колькасць сядзячых месцаў у ім, акрамя сядзення кіроўцы, не перавышае васьмі. Абавязак на дэклараванне пачынаецца пасля продажу яшчэ аднаго грузавога аўтамабіля ці аўтобуса, калі ў першага агульная маса перавышае 3500 кг, а ў другога колькасць месцаў перавышае восем. Тут спецыялісты МПЗ удакладнілі, што, калі машына, якую вы прадалі, дасталася вам у спадчыну, падатак плаціць не трэба незалежна ад перыядычнасці адчужэння транспартных сродкаў на працягу каляндарнага года.

СТАР. 4

НАШЫ ПЕРАМАГЛІ

Каманда Прэзідэнта Беларусі заваявала «золата» Каляднага турніру

На «серабро» пасля ўпартай барацьбы пагадзілася расійская каманда, «бронзу» атрымала Чэхія. Як гэта было? Чытайце рэпартаж-справаздачу карэспандэнтаў «Звязды».

Фота БЕЛТА.

Дзень першы. Перамогі — за Швейцарыяй, Беларуссю, Расіяй і Чэхіяй

У стартавым матчы Каляднага турніру паміж камандамі Швейцарыі і Кітая перамога засталася за жыхарамі альпійскай краіны з лікам 7:4. У той жа дзень, але ўжо вечарам беларуская каманда сустрэлася з праціўнікам з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. Лік 12:7, і паядынак атрымаўся таксама даволі напружаны. Калі першы перыяд быў цалкам за намі — мы перамаглі, што называецца, усухую: з лікам 6:0, — то на працягу другога перыяду нашы партнёры амаль адыграліся, забіўшы нам ажно пяць галоў. У нас жа атрымалася забіць ім толькі аднойчы. Вызначальным аказаўся трэці перыяд, калі мы з лікам 5:2 перамаглі. У выніку з лікам 12:7 каманда Прэзідэнта Беларусі пачала сваё пераможнае шэсце.

Паралельна хакеісты Чэхіі «разгромна» перамаглі каманду Швецыі (19:3), а расіяне — каманду Балкан (19:1).

Дзень другі. Расклад: усухую і ўнічыю

У пятніцу зборная Расіі перайграла Швецыю з лікам 15:0, а зборная Чэхіі — каманду Балкан (25:3). Хакеісты Швейцарыі сыгралі ўнічыю з ААЭ — 4:4.

На другі дзень турніру каманда Прэзідэнта Беларусі супрацьстаяла кітайскім хакеістам. Вынік матча — 14:9 на карысць Беларусі. Сёлета кітайская каманда ўпершыню прымае ўдзел у гэтым спаборніцтве. Хакей паступова развіваецца ў Кітаі, асабліва сярод моладзі — зборная з'яўляецца адным з лідараў у Азіі. Аматарская каманда Кітая сфарміравана з гульцоў нацыянальнай каманды краіны і канадскіх хакеістаў, якія маюць кітайскія карані.

Сімвалічнае ўкідванне на пачатку матча зрабіў Філ Эспазіта. Легендарны хакеіст удзельнічаў у суперсерыі 1972 года паміж СССР і Канадай, з'яўляецца членам Залы хакейнай славы і мае шэраг высокіх узнагарод.

Матч пачаўся актыўна: ужо на другой хвіліне Канстанцін Кальцоў закінуў шайбу ў вароты праціўніка. Аўтарам другога гола стаў Аляксей Калюжны. У перапынку ён расказаў журналістам: «Нібыта і кар'ера ў мяне доўгая была, але кітайцам ніколі не даводзілася забіваць». Гэта першы Калядны турнір для Аляксея Калюжнага. Хакеіст падзяліўся, што гуляе з задавальненнем. Рады быў убачыць калег, якія гуляюць у іншых гарадах.

Кітайскі хакеіст Эрнест Лі адзначыў, што беларуская каманда вельмі моцная, добра кантралюе сітуацыю на лёдзе. «У нас было некалькі ўдалых спроб закінуць шайбу, але ў іх таксама добра працуе варатар».

Дзень трэці. Вызначыліся фіналісты

У трэці гульнявы дзень XIV Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакея адбыліся чатыры паядынкі. У групе А лёс першага месца вызначаўся ў гульні каманды Прэзідэнта Беларусі і хакеістаў са Швейцарыі: дарэчы, гаспадарам турніру дастаткова было згуляць унічыю, каб выйсці ў фінал, а швейцарцаў задавальняла толькі перамога. У групе В за выхад у фінал змагаліся лідары квартэта — зборныя Расіі і Чэхіі, якія да гэтага перамаглі па два разы.

Нягледзячы на турнірныя перспектывы, зборная Швейцарыі не здолела нічога супрацьпаставіць беларускай камандзе. Першы перыяд прайшоў пры поўным дамінаванні беларускіх хакеістаў — 4:1, у другім разрыў у тры шайбы захаваўся — 5:2. У апошнім перыядзе, нягледзячы на значна больш моцную гульню швейцарцаў, беларусы даціснулі саперніка, у выніку лік — 10:6, Беларусь стала першым фіналістам турніру. Дарэчы, адну з шайбаў Павел Белы закінуў у вароты сапернікаў з перадачы Аляксандра Лукашэнкі. Найлепшымі гульцамі паядынку прызнаныя нападаючы беларусаў Яраслаў Чупрыс і галкіпер швейцарцаў Марцін Крыстэн.

У матчы паміж камандамі Чэхіі і Расіі перамагла апошняя, лік — 3:9, зборная Расіі стала другім фіналістам. У іншым матчы ў групе А хакеісты Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў абыгралі сапернікаў з Кітая з разгромным лікам 10:2. У групе В зборная Балкан упершыню перамагла за час удзелу ў турніры — была абыграна Швецыя з лікам 10:7.

Дзень чацвёрты. Барацьба за кубак

У нядзелю ў барацьбе за трэцяе месца хакеісты Чэхіі абыгралі ААЭ з лікам 11:2 і другі раз сталі бронзавымі прызёрамі Каляднага турніру.

Ну а фінал атрымаўся напружаны. Змагаліся Беларусь і Расія — моцныя каманды з моцнымі гульцамі, нашчадкамі яшчэ савецкай школы, дзе «баязлівец не гуляе ў хакей».

Па выніках першага перыяду лідзіравала Беларусь з лікам 4:0. У другім перыядзе і беларускія, і расійскія вароты атрымалі па адной шайбе. А вось у трэцім і нашы, і расіяне ўпарта абаранялі свае вароты, і галоў амаль не было. І толькі за чатыры секунды да канца перыяду гулец пад нумарам «1» Аляксандр Лукашэнка забіў шайбу.

* * *

Пасля матча адбылася цырымонія ўзнагароджвання камандаў-пераможцаў і найлепшых гульцоў Каляднага турніру, а таксама рэспубліканскіх спаборніцтваў «Залатая шайба».

Найлепшымі гульцамі XIV Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Беларусі прызнаны: галкіпер — Сцяпан Гарачэўскіх (Беларусь), абаронца — Ян Галубоўскі (Расія), нападаючы — Павел Белы (Беларусь), найлепшым бамбардзірам стаў Вацлаў Крал (Чэхія) — 18 балаў (10 галоў і 8 перадач).

Што да «Залатой шайбы», то камандай-пераможцай стаў сталічны «Мядзведзь». Найлепшым варатаром прызнаны Дзмітрый Краснухін («Мядзведзь»), абаронцам — Аляксандр Галавач («Мядзведзь»), нападаючым — Ягор Рындзевіч («Мядзведзь»). Найлепшым бамбардзірам стаў Мікалай Лукашэнка («Грыфоны») — 16 балаў (10+6).

Надзея АНІСОВІЧ,
anisovich@zviazda.by
Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ,
lukashevich@zviazda.by
Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

З ВЕРАЙ, НАДЗЕЯЙ, ЛЮБОЎЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мітрапаліт Павел павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з Калядамі. «Мы гаворым сёння пра тое, што Божае Нараджэнне з'яўляецца святам не толькі планетарнага значэння, але на вякі вякоў. Пакуль будуць жыць людзі на зямлі, для іх гэта будзе сапраўды найвялікшае свята», — сказаў ён.

Кіраўніку дзяржавы Мітрапаліт пажадаў «дапамогі Божай у працах, добрага здароўя і многія леты».

«Асноўная мэта майго сюды візіту — падзякаваць нашаму Уладыку, святарам, усім, хто нясе гэты Божы крыж у імя духоўнасці нашага народа, за служэнне нашаму народу і дзяржаве. У міралюбнасці, спакоі і стабільнасці, якія існуюць на гэтым няпростым кавалку зямлі, на скрыжаванні усіх дарог, вялікі ўклад нашай царквы. усіх нашых канфесій, асабліва святароў Праваслаўнай царквы. Усё ж такі гэта самая вялікая канфесія ў нашай дзяржаве, — сказаў Прэзідэнт. — Адпаведна, і народ вам адказвае мірам і дабром. Давайце гэта дабро, гэты мір будзем берагчы як зрэнку вока».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што галоўная каштоўнасць — гэта мір і спакой, якія не бяруцца ніадкуль, а грошы заўсёды можна знайсці і зарабіць. «І ён (Гасподзь) бачыць усё. Калі мы не будзем гэта берагчы, пакарае абавязкова. Таму давайце берагчы гэты мір. Ён для нас вельмі важны», — заклікаў беларускі лідар.

«Як сказаў наш Уладыка, сын Божы прыйшоў, каб узнесці нас на нябёсы. Вось пакуль ён нас туды пакліча, давайце на гэтай зямлі зробім максімум, каб там нам не было сорамна», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Галоўнай падзеяй 2017 года ў Беларусі ён назваў пераадоленне негатыўных тэндэнцый у эканоміцы. «Мы пражылі вельмі складаны год. Я не буду ўдавацца ў падрабязнасці, ужо шмат казаў і ў канцы года, і ў сваім навагоднім звароце. Але галоўная ўсеагульная падзея гэтага года — што у нас, як мы і марылі год таму (я ў тым ліку, стоячы тут, казаў пра гэта), атрымалася пераадолець негатыўныя тэндэнцыі ў нашай эканоміцы, і гэта тут жа паўплывала на ўсё наша грамадства», — заявіў Прэзідэнт.

«Жыццё ў нас не цудоўнае, я гэта разумею, яно цярпімае. У гэтым годзе мы павінны зрабіць крок наперад, падняцца на прыступку вышэй, каб гэта жыццё было не проста цярпімае, а нармальнае. Асаблівасць сёлетняга моманту ў тым, што ў нас усё для гэтага ёсць. І мы абавязкова павінны разам з вамі зрабіць гэты крок, на гэтую прыступку падняцца, і тады ў нас праз год будзе пра што гаварыць, і ў нас зусім іншы будзе настрой», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што будзе імкнуцца зрабіць усё для таго, каб на беларускай зямлі людзі жылі добра і каб госці краіны адчувалі, што беларусы — моцныя людзі, якія жывуць нядрэнна і гатовыя любога госця з удзячнасцю прымаць.

«Мы жывём надзеямі на будучыню, і я ўпэўнены, што гэтыя надзеі ў годзе, які пачаўся, спраўдзяцца», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Ён перадаў у дар Беларускай праваслаўнай царкве абраз Раства Хрыстовага, напісаную ва ўнікальнай тэхніцы васковай тэмперы. Іканаграфія блізкая да Полацкай фрэскі і традыцыйная для беларускай школы іканапісу XII стагоддзя. Абраз уяўляе сабой шматфігурную кампазіцыю з тонкай, мініяцюрнай дэталізацыяй.

Мітрапаліт Павел падарыў Аляксандру Лукашэнку ікону «Збавіцель». Яна прывезена Мітрапалітам з Іерусаліма і асвечана на Гробе Гасподнім.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У Бундэстагу прапанавалі абмежаваць тэрміны знаходжання на пасадзе канцлера

Віцэ-прэзідэнт нямецкага парламента, лідар фракцыі Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (СДПГ) Томас Оперман выказаўся на карысць абмежавання часу знаходжання на пасадзе канцлера двума тэрмінамі, паведамляе Welt.

«Канцлер — самая цяжкая работа ў Германіі», — заявіў палітык, дадаўшы, што праз дзесяць гадоў «знаходзіць новыя імпульсы або рэагаваць на іх, як таго патрабуе дэмакратыя, наўрад ці магчыма». У той жа час, адзначыў ён, тэрмін паўнамоцтваў канцлера можа быць прадоўжаны з чатырох да пяці гадоў.

Цяпер у Германіі канцлер абіраецца бундэстагам на чатыры гады. Колькасць тэрмінаў, на працягу якіх адзін і той жа канцлер можа займаць гэтую пасаду, не абмежавана. Цяперашні канцлер Ангела Меркель займае гэты пост ужо на працягу 12 гадоў — тры тэрміны запар. Восенню 2017 года на парламенцкіх выбарах кансерватыўны блок Меркель — Хрысціянска-дэмакратычны саюз і Хрысціянска-сацыяльны саюз (ХДС/ХСС) — ізноў атрымаў большасць месцаў у бундэстагу. Аднак да гэтага часу блоку Меркель не ўдаецца стварыць кіруючую кааліцыю ва ўрадзе, што пакідае адкрытым пытанне аб яе новым тэрміне на пасадзе канцлера.

СМІ даведаліся дэталі працоўнага раскладу Дональда Трампа

Амерыканскі прэзідэнт Дональд Трамп пачынае свой дзень пазней, чым у першыя дні свайго прэзідэнцтва, а падчас «вырашэння адміністрацыйных пытанняў» глядзіць тэлевізар і публікуе паведамленні ў «Твітар». Пра гэта са спасылкай на расклад прэзідэнта, які паступіў у распараджэнне рэдакцыі, паведамляе выданне Axios.

«У Трампа ў раскладзе ёсць графа «час для вырашэння адміністрацыйных пытанняў» з 8 да 11 раніцы, але рэальнасць такая, што ён праводзіць гэты час у сваёй рэзідэнцыі за праглядам тэлевізара, тэлефанаваннямі і сацсеткай «Твітар», — сказана ў паведамленні. У Авальны кабінет на першую сустрэчу прэзідэнт прыходзіць да 11 раніцы. Адзначаецца, што гэта «значна пазней», чым першыя сустрэчы, якія праводзілі 43-і прэзідэнт ЗША Джордж Буш-малодшы (06—45) і яго зменшчык на пасадзе прэзідэнта Барак Абама (9.00—10.00).

Як паведамляе выданне са спасылкай на неназванага памочніка прэзідэнта, працоўны дзень Трампа ў Авальным кабінеце праходзіць з 11 раніцы да шасці вечара. У гэты час ён праводзіць «каля дзвюх сустрэч», тэлефануе і глядзіць навінавыя праграмы, затым вяртаецца ў жылую частку Белага дома і зноў глядзіць тэлевізар ці робіць тэлефонныя званкі.

Нетаньяху стварыў рабочую групу па праграме штучных астравоў ля берагоў Ізраіля

Прэм'ер-міністр Ізраіля Біньямін Нетаньяху распарадзіўся стварыць рабочую групу па прасоўванні праекта фарміравання штучных астравоў для перанясення на іх інфраструктурных аб'ектаў з узбярэжжа краіны. Пра гэта сам кіраўнік урада паведаміў на штотыднёвым пасяджэнні кабінета міністраў.

— У нас ёсць берагі з вельмі важнымі інфраструктурнымі аб'ектамі, такімі як апрасняльныя ўстаноўкі і электрастанцыі, і стварэнне штучных астравоў уздоўж узбярэжжа Ізраіля з перанясеннем усіх гэтых аб'ектаў вызваліць берагі і, натуральна, дадасць нам плошчы», — сказаў Нетаньяху. Выказванні прэм'ера распаўсюдзіла яго канцылярыя.

Нетаньяху адзначыў, што «Ізраіль — адна з самых густанаселеных краін у свеце, а да сярэдзіны стагоддзя стане, па прагнозах, самай густанаселенай». «Іншыя краіны ажыццявілі грандыёзныя падобныя праекты, мы вучымся ў іх», — дадаў ён.

ЗІМОЙ ПАКУЛЬ НЕ ВЕЕ

У снежні снегу амаль і не было

Кліматычная зіма ў Беларусі пачнецца ў студзені, паведаміла на прэс-канферэнцыі начальнік аддзела клімату службы навукова-метадычнага забеспячэння гідраметэаралагічных назіранняў і фондаў даных Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Алена КАМАРОЎСКАЯ.

Падтопленая набярэжная каля драмтэатра ў Віцебску. Фота БЕЛТА.

Яна паведаміла, што 2017-ы завяршыўся анамальна цёплым снежнем. Сярэднямесячная тэмпература склала плюс 0,6 градуса — гэта вышэй за кліматычную норму на 3,9 градуса. Такім цёплым снежань бывае прыкладна раз на 15 гадоў.

А на гэтым тыдні ў Беларусі надвор'ем будзе кіраваць антыцыклон, які прынясе маразы да мінус 9 градусаў. Тэмпературны фон адразу панізіцца, і нарэшце выгляне сонца. Чакаецца, што будзе ў асноўным без ападкаў, таму на аднаўленне снежнага покрыва разлічваць не выпадае.

Сёння ўмовы надвор'я будзе ў асноўным вызначаць зона павышанага атмасфернага ціску, так што будзе пераважна без ападкаў. Толькі па паўночным усходзе краіны пад уплывам малаактыўнага франтальнага падзелу пройдзе невялікі мокры снег. Раніцай месцамі чакаецца туман. Максімальная тэмпература паветра ўдзень — ад мінус 3 да плюс 2 градусаў. У сераду істотных змен у надвор'і не чакаецца. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы ў асобных раёнах па паўночным усходзе краіны магчымы кароткачасовы снег. Тэмпература паветра ў ноч на чацвер складзе 2—8 марозу, удзень — ад мінус 2 да плюс 3 градусаў.

У чацвер і пятніцу марозіць будзе выключна ў начны час. У антыцыклон стане пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы на чацвер складзе ад мінус 2 па паўднёвым захадзе да мінус 9 градусаў па ўсходзе краіны, днём будзе ад мінус 3 да плюс 2 градусаў. У пятніцу стане халадней і ўдзень. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 марозу, удзень будзе ад нуля да мінус 5 градусаў.

У топ-10 цёплых гадоў

Алена Камароўская падлічыла, што 2017 год у цэлым быў цёплы. Сярэднегадавая тэмпература паветра склала плюс 7,6 градуса — гэта на 0,9 градуса вышэй за кліматычную норму. 2017 год заняў дзявятае месца ў ранжыраваным шэрагу назіранняў ад найбольш цёплага да найбольш халоднага. «Самым цёплым быў 2015 год з сярэднегадавой тэмпературай плюс 8,5 градуса», — сказала Алена Камароўская.

Тэмпература паветра перавысіла кліматычную норму ў сямі з 12 месяцаў 2017 года. «Выключна цёплыя ў гэтым годзе былі сакавік і снежань, калі адхіленні тэмпературы ад нормы склалі 4,1 градуса і 3,9 градуса адпаведна. У Езярышчы 7 студзеня была зарэгістраваная самая нізкая тэмпература паветра за мінулы год — мінус 34,4 градуса. Самая высокая тэмпература за 2017 год была зафіксаваная 31 ліпеня ў Брэсце — плюс 32,6 градуса. Гэтым летам было адзначана ад 14 да 59 гарачых дзён (з тэмпературай плюс 25 градусаў і вышэй) пры норме ад 28 да 60 такіх дзён. Лік вельмі гарачых дзён (з тэмпературай плюс 30 градусаў і вышэй) у гэтым годзе склаў ад 1 да 17. Звычайна колькасць вельмі гарачых дзён летам у Беларусі — ад 3 да 15», — адзначыла начальнік аддзела клімату.

На адной мове з Еўропай

Белгідрамет плануе ўкараніць вопыт еўрапейскіх гідраметэаралагічных службаў па адрасным абслугоўванні спажыўцоў, паведаміла **першы намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Марыя ГЕРМЯНЧУК.**

Вядома, што нашы спецыялісты ў лістападзе — снежні летась наведалі найбуйнейшыя нацыянальныя гідраметслужбы Еўропы — польскую і французскую. Атрыманы цікавыя вынікі. Цяпер ідзе гаворка пра тое, каб тыя тэхналогіі, якія паспяхова выкарыстоўвае гідраметслужба Польшчы, укараняць у нас. «Хацелася б наладзіць кантакт з польскай гідраметслужбай, каб мы маглі атрымліваць інфармацыю з іх сеткі назіранняў у рэжыме рэальнага часу, а не раз на тры гадзіны, як звычайна робіцца ў сістэме Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі. Што датычыцца французскай нацыянальнай гідраметслужбы, мы ацэнім, якія яе мадэлі зможам выкарыстаць у нас. Плануем укараніць той вопыт, які выкарыстоўваюць еўрапейскія гідраметслужбы па адрасным абслугоўванні спажыўцоў, асобных галін эканомікі, таму што ў кожнай з іх свае патрэбы. Менавіта гэтая задача стаіць перад намі ў 2018 годзе», — сказала Марыя Гермянчук.

Айчынныя сіноптыкі выкарыстоўваюць інфармацыю з двух доплераўскіх радыёлакатараў — у Нацыянальным аэрапорце «Мінск» і ў Гомелі. «Лакатары — гэта неабходны элемент пры прагназаванні, асабліва каротказтэрміновым, таму што яны могуць рэгістраваць у атмасферы перадумовы ўзнікнення неспрыяльных і небяспечных з'яў. З польскай гідраметэаралагічнай службай мы цяпер вырашаем пытанне абмену інфармацыяй з метэаралагічных радараў у рэжыме рэальнага часу. Мы ўжо падрыхтавалі праект пагаднення. Прынцыповых тэхнічных перашкод няма. Будзем разлічваць, што ў найбліжэйшы час нашы польскія калегі прымуць рашэнне, і мы будзем працаваць у агульнай інфармацыйнай прасторы», — адзначыла першы намеснік начальніка Белгідрамета.

У рэжыме рэальнага часу

«Важным напрамкам нашай працы з'яўляецца комплексны маніторынг стану навакольнага асяроддзя ў зоне будаўніцтва БелАЭС. Зараз мы ажыццяўляем маніторынг па некалькіх напрамках — метэаралагічны, кліматычны, гідралагічны маніторынг, маніторынг хімічнага забруджвання атмасфернага паветра і паверхневых вод. У цэнтры ўсёй гэтай працы знаходзіцца радыяцыйны маніторынг. Мы ўжо правялі фонавае даследаванне стану навакольнага асяроддзя да запуску БелАЭС, цяпер ідзе назапашванне статыстычнай інфармацыі, якая дасць магчымасць у будучыні ацэньваць уздзеянне атамнай станцыі на стан навакольнага асяроддзя. Дзейнічае аўтаматызаваная сістэма кантролю радыяцыйнай абстаноўкі ў раёне БелАЭС. Інфармацыя паступае ў рэжыме рэальнага часу», — сказала Марыя Гермянчук.

Сістэма забяспечаная спецыялізаванымі датчыкамі, якія ў рэжыме рэальнага часу рэгіструюць любыя змены ў радыяцыйнай абстаноўцы. «Гэта гарантуе належны ўзровень радыяцыйнай бяспекі навакольнага асяроддзя і насельніцтва ў зоне БелАЭС», — падкрэсліла першы намеснік начальніка Белгідрамета.

Зімовая паводка на Заходняй Дзвіне

Анамальна цёплае надвор'е канца снежня і пачатку студзеня прывяло да раставання лёду і снегу, што ў сваю чаргу выклікала паводку на Заходняй Дзвіне.

Прыкладна з 26 снежня на прытоках галоўнай ракі Віцебскай вобласці пачала падымацца вада. Яе ўзровень за суткі вырастаў на 1—46 см. У Віцебску максімальны рост вады быў адзначаны якраз у Новы год. Так, 31 снежня вада ў Заходняй Дзвіне прыбыла на 56 см, 1 студзеня — на 54 см. У цэлым з 26 снежня па 7 студзеня рака паднялася з 255 см да 529 см над нулём паста. Сённяшняе значэнне — 525 см, паведамілі ў аблгідрамеце.

Паколькі ўзровень вады ў Заходняй Дзвіне ўжо пачаў змяншацца (і, паводле папярэдніх прагнозаў, такая тэндэнцыя захаваецца), то небяспекі падтаплення тэрыторый няма. Спецыялісты растлумачылі, што зімовая паводка ў апошні час адзначалася ў рэгіёне не так часта і звычайна здараецца ў канцы зімы. Цяперашняй паводцы акрамя цёплага надвор'я паспрыяла і тое, што рэкі ўступілі ў зіму з досыць высокім узроўнем вады.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Святочнае

Цуд, які стварае настрой

і спрыяе выздараўленню маленькіх пацыентаў лячэбных установ

Уручэнне падарункаў ад Прэзідэнта краіны праходзіць на Гомельшчыне. Віншаванні з навагоднімі і каляднымі святамі і каля 600 падарункаў атрымалі выхаванцы Гарадзецкай і Улукаўскай дапаможных школ-інтэрнатаў, спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы № 70, Гомельскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы і абласнога дома дзіцяці. Падарункі ўручалі прадстаўнікі дэпутацкага корпуса.

У межах дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў наведвалі дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы, апякунскія і прыёмныя сем'і, дзіцячыя бальніцы. У спецыяльнай агульнаадукацыйнай школе № 70 Гомеля для навучэнцаў з парушэннем слыху ганаровую місію ўручэння падарункаў выканаў **намеснік старшыні Гомельскага гарвыканкама Віталь АТАМАНЧУК**. Ён разам з Дзедам Марозам, Снягуркай і героямі вядомых мультфільмаў уручыў дзецям цацкі, якія развіваюць, і настольныя гульні. Прадстаўнік улады падкрэсліў, што традыцыйная дабрачынная акцыя «Нашы дзеці» ніколі не згубіць сваёй актуальнасці:

— Напэўна, у назве самой акцыі — яе галоўны сэнс: увага дзяржавы да нашых дзяцей. У гэтай школе навучаюцца дзеці з асаблівасцямі развіцця. Дарэчы, яны не раз станавіліся пераможцамі розных абласных і рэспубліканскіх конкурсаў і спаборніцтваў. Амаль усе навучэнцы ўстановы наведваюць спартыўныя секцыі.

У спецыяльнай агульнаадукацыйнай школе № 70 Гомеля цяпер атрымліваюць адукацыю 82 вучні з рознай ступенню парушэння слыху. Навучанне вядзецца з выкарыстаннем гукаўзмацняльнай апаратуры калектыўнага карыстання, тэхнічных сродкаў, якія забяспечваюць перадачу навучальнага матэрыялу і іншай інфармацыі.

Больш за 200 навагодніх падарункаў ад кіраўніка дзяржавы атрымалі дзеці, якія па стане здароўя вымушаны сустракаць святы ў стацыянары гомельскай абласной клінічнай бальніцы. Салодкія прэзенты ім перадалі **старшыня абласнога Савета дэпутатаў Алег БАРЫСЕНКА і дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Мікалай ВАСІЛЬКОЎ**. Госці пажадалі маленькім пацыентам як мага хутчэй акрыяць і вяртацца дадому:

— Перад Калядамі кожнае дзіця чакае цуду і жадае атрымаць падарунак, — адзначыў Алег Барысенка. — Штогадовая дабрачынная акцыя яшчэ раз пацвярджае, што Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка клапоціцца ў першую чаргу пра дзяцей — будучае нашай краіны. Невыпадкова ўзвядзенне новага комплексу дзіцячай абласной бальніцы ў Гомелі знаходзіцца пад пільным кантролем кіраўніка дзяржавы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

Каляды — час цудаў і відовішчаў

Куцця на стале, сена пад абрусам, калядоўшчыкі ў санях... Усе гэтыя атрыбуты аднаго з галоўных праваслаўных свят дагэтуль дзе-нідзе бачыш у хатах ды вёсках, дзе Божае Нараджэнне сустракаюць па спрадвечных традыцыях.

Сучасныя святкаванні, пэўна, больш тэатралізаваныя ды відовішчныя. Але ад гэтага не менш шчырыя і багатыя на цуды. У Райцы Карэліцкага раёна, напрыклад, адбыліся «Калядныя прыгоды Бураціна», а ў Гальшанах на Ашмяншчыне — узышла «Зорка Раства» *(на фота)*.

У аддзеле культуры і вольнага часу аграгарадка Гальшаны на тэатралізаваным святе калядоўшчыкі праслаўлялі народжанае Боганемаўля. Светлы Анёл нёс навіну пра гэта ў свет. Няўрымслівая нечысць, як магла, паўставала супраць свята і намагалася сапсаваць яго. І дарослыя, і малыя гледачы былі ў такім захапленні, што свята Нараджэння Хрыстовага пад калядныя песні, танцы ды карагоды працягнулася на вуліцы каля ёлкі аж дацямна.

Прадстаўленне тэатра «Райцаўская батлейка», дзе ўсе артысты — дзеці, песнапенні навучэнцаў нядзельнай школы і тэатралізаванае прадстаўленне «Калядныя прыгоды Бураціна» ў выкананні дарослых акцёраў. Гэтыя мерапрыемствы сталі яскравымі разынкамі Калядных гульняў, конкурсаў ды карагодаў у сельскім клубе аграгарадка Райца. А скончылася свята гарбатай на травах ды свойскай выпечкай.

Божае Нараджэнне, якое лічыцца сямейным, чароўным і поўным надзей святам, можна адзначаць ажно да 14 студзеня.

Ірына СІДАРОК.
sidarok@zviazda.by

■ Добрая навіна

У Магілёве ўпершыню трансплантавалі нырку

Аперацыя была праведзена на базе Магілёўскай абласной бальніцы 6 студзеня. На раніцу ўчарашняга дня 58-гадовы пацыент са Шклова, якому была перасаджана нырка, знаходзіўся ў адпаведным пасляаперацыйнаму перыяду стане. Як паведаміў загадчык аддзялення гемадыялізу і нефралогіі Яўген ЖАГОЛКІН, мужчына ўжо праведзены з рэанімацыі.

Падрыхтоўка да правядзення аперацый такога ўзроўню вялася на працягу ўсяго мінулага года. Магілёўскія хірургі, анестэзіёлагі, аперацыйная медсястра неаднаразова праходзілі вучобу ў рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры трансплантацыі органаў і тканак. Праявіць сваё майстэрства падчас першай у Магілёве аперацыі па перасадцы ныркі змаглі хірургі абласной бальніцы Сяргей Петрашэўскі, Яўген Котаў, Дзяніс Сіткевіч. Іх дзеянні каардынаваў хірург РНПЦ Леанід Ткачоў.

— Плануецца, што на першым этапе ў Магілёве будзе ажыццяўляцца да 30 такіх аперацый у год, — адзначыў Яўген Жаголкін. — Усё неабходнае для гэтага ў нас ёсць. Закуплена спецыяльнае біяхімічнае абсталяванне, апарат УГД, неабходны хірургічны інструмент. А нашы ўрачы ўжо неаднаразова дэманстравалі высокія вынікі ў сваёй рабоце.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Меркаванне

СТА́ЛЫ З МАЛЕНСТВА?

Чым карысная сумесная праца «дзіцячых» і «дарослых» дактароў

Фота БЕЛТА.

Нядаўна сяброўка чарговы раз пачала скардзіцца, як дрэнна, што няма ў нас асобнай паліклінікі для дзяцей. Даводзіцца вадзіць малых праз тыя ж дзверы, у якія хворыя дарослыя ходзяць. Ды і ў чэргах да вузкіх спецыялістаў у агульнай чарзе без талончыка маму з дзіцем, якому ўжо гады тры, амаль ніколі не прапусцяць уперад. Так, гэта пэўныя хібы інтэграванай паліклінікі, дзе лечацца, як кажуць, і малыя, і старыя. Аднак ёсць у такой з'явы і плюсы, якіх значна больш, лічаць урачы.

У беларускіх мястэчках, дарэчы, нават не паўстае пытанне падзялення на сталых і дзяцей, бо там часцей за ўсё адна паліклініка на ўвесь раён. У сталіцы, між іншым, інтэграваных устаноў аховы здароўя чатыры: 4-я, 10-я, 36-я і 37-я паліклінікі.

Карысныя сумесныя паліклінікі перш за ўсё тым, што «18-гадовыя дзеці», якія пераходзяць ад педыятра да тэрапеўта, псіхалагічна лягчэй адаптуюцца да «дарослага» лячэння. Яны з маленства прывыкаюць і да будынка, і да супрацоўнікаў.

— Акрамя педыятра, астатнія ўрачы ў дзяцей адразу тыя ж, што і ў дарослых. Гэта змешанае аддзяленне медыцынскай рэабілітацыі, куды дзеткі на фізіяпрацэдуры ходзяць разам з дарослымі пацыентамі. Адны і тыя ж спецыялісты лабараторыі, дзе малыя здаюць аналізы, — кажа **Наталля МЫСЛІЎЧЫК, галоўны ўрач 36-й гарадской паліклінікі.** — Оталарынголагі, траўматолагі, хірургі ў нас таксама вядуць змешаны прыём. Дзеці ў чарзе разам з дарослымі сядзяць і да іх, і ў кабінеты на ўльтрагукавую дыягностыку. Ім не трэба адаптавацца да новых калідораў і твараў. Да таго ж, той жа хірург у дзіцячай паліклініцы, як правіла, працуе толькі ў адну змену. Калі ў яе не паспеў — прыходзіцца звяртацца ў спецыялізаваны цэнтр. А ў інтэграванай медустанове ўрачы на месцы ўвесь дзень.

Вельмі важны плюс, на думку галоўнага ўрача, наяўнасць траўматолага, якога звычайна няма ў дзіцячых паліклініках. Калі нешта здараецца, малых прыходзіцца вазіць у спецыялізаваныя цэнтры і там жа назірацца. А ў інтэграванай паліклініцы гэты спецыяліст на месцы на працягу рабочага дня. Да таго ж, выйшаў ад яго — і пайшоў на патрэбныя фізіяпрацэдуры на іншы паверх. А не так, што ў адным канцы горада працэдуры атрымліваеш, а ў іншым — ва ўрача назіраешся.

Яшчэ адзін станоўчы момант — сумеснае навучанне ўрачоў і пашырэнне сферы іх ведаў на практычных прыкладах.

— У нас і педыятры, і стаматолагі, і тэрапеўты, і спецыялізаваныя ўрачы ходзяць на адны вытворчыя нарады. Сітуацыі, якія мы разбіраем, і спецыялізаваныя лекцыі, якія наведваем, аказваюцца цікавымі і для дактароў іншых спецыяльнасцяў з пазіцыі жыццёвай практыкі, — упэўнена Наталля Мыслiўчык. — Урач павінен глядзець крыху шырэй за межы сваёй спецыялізацыі, тады ў яго лепш атрымліваецца і ўсё астатняе, ён думае. Гэта важна яшчэ і таму, што тая ж артэрыяльная гіпертэнзія маладзее. Інфаркт міякарда здараецца, на жаль, і ў 15-гадовых.

Праца «дзіцячых» і «дарослых» дактароў побач у адной паліклініцы дапамагае нават выкрыць праблемныя сацыяльна-небяспечныя моманты ў сям'і. Напрыклад, нешта падазронае адносна дзіцяці заўважыць тэрапеўт, якога выклікалі да дарослага. Або на прыём да гінеколага прыйдзе нецвярозая цяжарная, здараецца і такое, уздыхае ўрач. Гэтая інфармацыя адразу перадаецца педыятру па тэлефоне, без доўгага афармлення папер і фармальных працэдур. Такі чынам наладжваецца цесная сувязь паміж урачамі розных спецыяльнасцяў.

Так што, пэўна, не трэба спяшацца адразу лаяць тое, што на першы погляд нязручна.

Ірына СІДАРОК.
sidarok@zviazda.by

НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПАДАЦЬ ПАДАТКОВУЮ ДЭКЛАРАЦЫЮ

Адна кватэра — за 5 гадоў

Запаўняць дэкларацыю па выніках года павінны тыя, хто на працягу пяці апошніх гадоў прадаў іншым фізічным асобам другую кватэру ці другі жылы дом, больш за адзін садовы домік, больш за адзін гараж (зямельны ўчастак, машына-месца), якія належаць чалавеку на праве ўласнасці.

Тут эксперты міністэрства ўдакладняюць, што пры атрыманні на працягу 2012—2017 гадоў даходаў ад продажу аднаго наймення аб'екта нерухомасці (напрыклад, у 2014 годзе — адной кватэры, а ў 2017 годзе — аднаго жылога дома) фізічная асоба вызваляецца ад падачы падатковай дэкларацыі (разліку), бо такія даходы вызваляюцца ад падаходнага падатку.

Увогуле не існуе колькаснай падатковай ільготы на продаж аб'ектаў нерухомасці, якія не адносяцца да кватэры, жылога дома з гаспадарчымі пабудовамі (пры іх наяўнасці), дачы, садовага доміка, гаража, машына-месца і зямельнага ўчастка. Калі ўласнік прадаў нават адзін такі аб'ект камерцыйнай нерухомасці, тады ён абавязаны запоўніць дэкларацыю. Да такіх аб'ектаў, напрыклад, належаць гандлёвыя, офісныя і адміністрацыйныя памяшканні.

І ў гэтым выпадку існуе выключэнне з правілаў. Прадаваць у кароткі тэрмін можна любую колькасць машын, дамоў, дач ці зямельных участкаў і іншую нерухомасць, калі ўсё гэта было атрымана ў спадчыну. І галоўнае, што падаваць дэкларацыю і плаціць падаткі ў гэтым выпадку не трэба незалежна ад перыядычнасці адчужэння нерухомасці на працягу пяцігадовага перыяду.

Дакладна лічым падарункі

Падлічваць за год трэба і тыя даходы, якія былі атрыманы ад продажу ці іншага выплатнага адчужэння долі (паю, часткі долі або паю) у статутным фондзе арганізацыі іншай фізічнай асобе. Тут без варыянтаў. Іншая справа — падарункі.

Калі чалавек летась атрымліваў даходы ў выглядзе дарэння ад фізічных асоб, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, у памеры, большым за 5 555 рублёў ад усіх крыніц на працягу года, тады без дэкларацыі яму не абысціся. Падаткаабкладанню падлягае менавіта сума такога перавышэння. У гэтым выпадку падлічваецца не толькі сума грашовых падарункаў, але ўлічваецца і кошт іншай падараванай маёмасці, у тым ліку нерухомай.

Выключэнне складаюць выпадкі атрымання даходаў ад асоб, якія знаходзяцца паміж сабой у адносінах сваяцтва. Менавіта тады падобныя падарункі вызваляюцца ад падаходнага падатку незалежна ад памеру атрыманага ў выніку дарэння даходу.

Асобамі, якія знаходзяцца ў адносінах блізкага сваяцтва, лічацца бацькі (усынавіцелі), дзеці (у тым ліку ўсыноўленыя, удачараныя), родныя браты і сёстры, дзед, бабуля, унукі, прадзед, прабабуля, праўнукі, муж і жонка. У адносінах сваяцтва будуць блізкія сваякі мужа або жонкі, у тым ліку памерлых.

Даход ад арэнды лепш падлічыць да капейкі

Гэта датычыцца тых кліентаў інспекцый, хто летась здаваў сваю ўласную кватэру на працяглы тэрмін і плаціў фіксаваны падатак. Цяпер яны павінны падлічыць гэты даход ад здымнага жылля за ўсе 12 месяцаў. Калі такія даходы ад здачы ў арэнду жылых і нежылых памяшканняў дасягнулі агульнай сумы 5 555 рублёў і больш, тады трэба наведваць падатковую інспекцыю. Потым такія даходы абкладаюцца падаходным падаткам па стаўцы 13 працэнтаў. Пры гэтым сумы падаходнага падатку ў фіксаваных сумах, выплачаныя за 2017-ы, падлягаюць заліку пры вылічэнні падатку па стаўцы 13 працэнтаў.

Напрыклад, у прэс-службе МПЗ падлічылі, што пры атрыманні агульнага даходу за здачу аднапакаёвай мінскай кватэры ў памеры 6000 рублёў дадатковы аб'ём падаходнага падатку па пададзенай дэкларацыі складзе каля 520 рублёў. І гэтую суму ўласніку жылля лепш падлічыць да першых дзён вясны і заплаціць добраахвотна да 15 мая.

Сума падаходнага падатку ў гэтым прыкладзе да даплаты падлічваецца так: 780 рублёў — 258 рублёў = 522 рублі. Тут 780 рублёў — сума падаходнага падатку, вылічаная па стаўцы 13 працэнтаў, а 258 рублёў — агульная сума падаходнага падатку ў фіксаваных сумах, выплачаная за 2017 год.

Заробкі з-за мяжы

Эксперты падатковай галіны асобна адзначаюць, што абавязкова дэкларуюцца любыя даходы, што былі атрыманы падаткаплацельшчыкамі за мяжой і (або) з-за мяжы нашай краіны.

Гэта могуць быць грошы ад працы па найме (кантракце), даходы ад продажу акцый або іншых каштоўных папер, ад продажу доляў у статутных фондах замежных арганізацый, у выглядзе працэнтаў па рахунках (укладах) у замежных банках, атрыманыя ў дар ад замежных грамадзян і інш.

Фактычна выплачаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы сумы падатку з даходаў, атрыманых у такой замежнай дзяржаве (за выключэннем даходаў, атрыманых з афшорных зон), падлягаюць заліку пры вызначэнні сумы падаходнага падатку, які налічваецца падатковым органам Беларусі на падставе падатковай дэкларацыі. Тут існуе адзін нюанс. Такі залік ажыццяўляецца работніку пры ўмове прадастаўлення дакумента аб атрыманым даходзе і ўтрыманым падатку, пацверджаным падатковым або іншым кампетэнтным органам замежнай дзяржавы.

Такое пацвярджэнне даецца фізічнай асобай альбо ў момант падачы падатковай дэкларацыі (разліку), альбо на працягу аднаго года з дня падачы заявы аб правядзенні заліку падатку, які быў аплачаны ў бюджэт замежнай дзяржавы.

Пры спыненні будаўніцтва і пагашэнні жыллёвых аблігацый

Па выніках года дэкларуецца і даход, атрыманы грамадзянінам праз механізм вяртання раней унесеных сродкаў пры спыненні будаўніцтва жылля, а таксама ў выпадку патаннення такога будаўніцтва альбо ў выпадку выбыцця фізічнай асобы з членаў арганізацый забудоўшчыкаў.

Тут спецыялісты падатковай галіны адзначаюць, што вернутыя пры гэтым грашовыя сродкі, у тым ліку паявыя ўзносы, падлягаюць падаткаабкладанню падаходным падаткам у выпадку, калі на такія ўзносы раней быў прадастаўлены маёмасны падатковы вылік. У гэтым выпадку фізічная асоба, якой у 2017 годзе былі вернуты названыя вышэй грашовыя сродкі, абавязана падаць у падатковы орган падатковую дэкларацыю і заплаціць падаходны падатак у дачыненні да сум, на якія ёй раней была дадзена льгота па падаходным падатку ў выглядзе маёмаснага падатковага выліку.

Трэба дэкларaваць таксама і даходы, што былі атрыманы ў выглядзе грашовых сродкаў пры пагашэнні (датэрміновым пагашэнні) жыллёвых аблігацый, а таксама ў выглядзе вяртання грашовых сродкаў, унесеных у аплату кошту жылога памяшкання шляхам набыцця жыллёвых аблігацый, у выпадку невыканання забудоўшчыкам абавязацельстваў па дагаворы. Дэкларацыя тут падаецца ў тым выпадку, калі па такіх унесеных сумах для набыцця жыллёвых аблігацый раней быў прадастаўлены маёмасны падатковы вылік.

Такім чынам, былы забудоўшчык, які атрымаў летась такія грашовыя сродкі, абавязаны падаць у падатковы орган падатковую дэкларацыю і заплаціць падаходны падатак у дачыненні да сум, на якія яму раней была прадастаўлена льгота па падаходным падатку ў выглядзе маёмаснага падатковага выліку.

Падатковыя вылікі

Падатковую інспекцыю можна наведваць не толькі, каб пакінуць там грошы. Калі чалавек пераплаціў падаходныя падаткі за мінулы год, то праз інспекцыю гэтыя грошы ён можа яшчэ вярнуць. У гэтым выпадку дэкларацыю аб даходах за год падаюць тыя грамадзяне, якія маюць права на атрыманне падатковых вылікаў (сацыяльных, маёмасных і прафесійных), пры ўмове, што абавязак па прадастаўленні такіх вылікаў грамадзянам ускладзены на падатковыя органы. Вяртанне падатку ажыццяўляецца на працягу 30 дзён з моманту падачы фізічнай асобай адпаведнай заявы. Звычайна такія вылікі атрымліваюць работнікі па месцы асноўнай працы. Увогуле ўзор формы падатковай дэкларацыі аб даходах за год можна знайсці на афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах.

Лепш не забывацца

Парушэнне фізічнай асобай тэрміну прадстаўлення ў падатковы орган (не пазней 1 сакавіка) падатковай дэкларацыі за 2017 год цягне накладанне штрафу ў памеры двух базавых велічынь з павелічэннем яго на 0,5 базавай велічыні за кожны поўны месяц пратэрміноўкі, але не больш 10 базавых велічынь.

Даведачна, з 1 студзеня 2018 года памер базавай велічыні складае 24,50 рубля. Такім чынам, памер штрафу складзе ад 49 да 245 рублёў.

Пры парушэнні тэрміну выплаты падаходнага падатку (не пазней 15 мая), вылічанага на падставе прадстаўленай падатковай дэкларацыі за 2017 год, калі незаплачаная або няпоўнасцю заплачаная сума падатку перавышае адну базавую велічыню, цягне накладанне штрафу ў памеры 15 % ад нявыплачанай сумы падатку, але не меней 0,5 базавай велічыні. Такім чынам, памер штрафу складае ад 12,25 рубля і больш.

Дэкларaваць свае даходы па выніках года павінны і тыя грамадзяне, у каго ўтрыманне падатку з такіх сум не прадугледжана падатковымі агентамі — арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі. А вось тэрміну даўнасці па падатковых парушэннях не існуе. З улікам змяненняў у заканадаўстве з 1 студзеня 2018 года такія праверкі ажыццяўляюцца за апошнія пяць гадоў. Мне здаецца, што лепш такіх праверак не чакаць.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

№ 1 (85) Вторник, 9 января 2018 года

Для читателей Беларуси, России, Казахстана, Армении, Кыргызстана

Выходит 2 раза в месяц

Издается с 26 апреля 2014 года

СНОВА ЗА РАБОТУ

Фото БЕЛТА.

Иностранное общество с ограниченной ответственностью «ВМГ Индустри» планирует до 2020 года увеличить производство и экспорт мебели вдвое. На фото — старший сортировщик Елена АЛИСТРОВА.

Трудовые мигранты союза — те, кто действительно смогли вздохнуть более свободно после образования ЕАЭС. Даже в сравнении с нормами для граждан СНГ правила пребывания и трудоустройства выглядят намного либеральнее. Например, при переезде в Россию подоходный налог граждане государств ЕАЭС платят в том же размере, что и россияне, — 13 %. А работники из стран Содружества первые полгода платят 30 % и только после — 13 %.

Кроме этого, единый рынок трудовых ресурсов предполагает взаимное признание документов об образовании и квалификации, социальное обеспечение, оказание бесплатной скорой медицинской помощи и т. д. Однако не все нормы, о которых ведут речь уже с 2014 года, реализованы.

Проект Договора о пенсионном обеспечении трудящихся государств — членов ЕАЭС разрабатывается в соответствии с пунктом 3 статьи 98 Договора о Евразийском экономическом союзе. Предполагается, что после того, как он вступит в силу, каждая страна-участница будет определять право на пенсию и исчислять ее размер в соответствии со своим национальным законодательством. Предусмотрено суммирование страхового стажа и — что важно для тех, кто, поработав, захочет вернуться на родину, — будет решен вопрос экспорта пенсий. По мнению статс-секретаря — заместителя министра труда и социальной защиты Российской Федерации Андрея Пудова, «зная, что за период работы в государстве трудоустройства будет назначена пенсия этим государством, трудящийся будет заинтересован в легальном трудоустройстве с выплатой ему легальной заработной платы». Пока что с этими вопросами не разобрались, тем не менее трудовые мигранты активно выезжают на заработки.

Три года ЕАЭС

В 2015 год Беларусь входила с нетерпеливым ожиданием позитивных итогов от вновь создаваемого с первого января объединения — Евразийского экономического союза (ЕАЭС). Каковы трехлетние итоги развития ЕАЭС, оправдались ли ожидания стран-участниц, включая Беларусь, от членства?

Как показывает статистика, в наибольшем выигрыше, как и ожидалось многими, оказались самые слабые экономики, для которых вступление в ЕАЭС сняло барьеры на пути взаимодействия с лидерами на постсоветском пространстве. Армения и Кыргызстан (который вступил в ЕАЭС позже всех, в августе 2015 года) наращивают темпы своего роста, стремясь подтянутся к уровню России, Беларуси и Казахстана. Так, рост экономики Армении с 3 % в 2015-м может выйти почти на 6 % в 2017 году. У Кыргызстана рост экономики составил в 2015-м году 2 %. По итогам 2017 года ожидается около 4 %.

— Мне цікава было даведацца, як паводзіць сябе цяпер у гэтым свеце, калі столькі «хіміі» вакол, як захаваць сваё здароўе. Таму мы прапанавалі адкрыць школу экалогіі — запрашаць спецыялістаў, каб яны чыталі нам лекцыі і праводзілі майстар-класы. Спачатку супрацоўнічалі з грамадскім аб'яднаннем «Наш след». Цяпер — з «Цэнтрам экалагічных рашэнняў». Раз на месяц да нас прыходзяць іх эксперты і праводзяць заняткі.

Якія змены ўвайшлі ў маё жыццё? Я цяпер звяртаю ўвагу на склад прадуктаў і бытавой хіміі, якую купляю. Практычна адмовілася ад мыйных сродкаў для посуду. Гэта і для здароўя добра, і для прыроды. Бо ў іх склад уваходзіць мноства не самых карысных інгрэдыентаў: тыя ж фасфаты, напрыклад, якія потым разам з вадой трапляюць у глебу. Цяпер у мяне каля ўмывальніка стаяць гарчычны парашок, сода і воцат.

Я прапанавала сваім родным дома выкарыстоўваць іх для мыцця посуду, і гэта ўсім спадабалася: «Мы не чакалі, што ўсё так добра адмываецца гарчычным парашком, нават тлушч!». Цяпер і сын, і дачка, і нявестка так мыюць посуд, хоць і не ў ста працэнтах выпадкаў, але вельмі часта. Дзіцячы — дык адназначна.

Яшчэ я зрабіла натуральныя асвяжальнікі паветра. Гэта вельмі проста. У бутэльку з распыляльнікам наліваем ваду, змешаную са спіртам, і капаем эфірны алей, які вам падабаецца. Перад распыленнем устрэсваем. Можна разрэзаць лімон і пакласці яго долькі ў халадзільнік, і там не будзе непрыемнага паху. А ў прыбіральні можна выкарыстоўваць пітную соду: насыпаць у слоічак і капнуць пару кропель эфірнага алею. Сода добра ўбірае ў сябе і нейтралізуе розныя пахі. Быццам бы дробязі такія, але яны пакрысе могуць палепшыць жыццё.

Нам шмат расказвалі пра эканомію рэсурсаў, і мы ў сваёй кватэры ўжо памянялі ўсе лямпачкі на энергазберагальныя. Сочым за сабой, стараемся выключаць тэлевізар, камп'ютар з разеткі, калі не карыстаемся. Здавалася б, ён усё адно выключаны, але электраэнергія, хай трохі, але траціцца...

Яшчэ я стала практыкаваць раздзельны збор смецця: пластык, шкло, паперу — усё збіраю паасобку. Спачатку з мяне дома трохі жартавалі, а цяпер кожны пытаецца: дзе твая макулатура ляжыць, куды скрыначку паставіць? А дзе твой пакецік з бутэлькамі, нам бутэльку выкінуць трэба... Вось так паступова за мной уцягваецца і моладзь...

«Штучныя кветкі на могілках вельмі моцна шкодзяць экалогіі»

Лілія Салаўёва:

— У «Экалогіі і Я» нам шмат расказвалі пра эканомію прыродных рэсурсаў. Я пасля адной лекцыі, якую нам прачытаў малады чалавек з Цэнтра экалагічных рашэнняў, купіла адмысловую насадку, якая накручваецца на водаправодны кран, і ў выніку вада цячэ дробнымі струменьчыкамі. Гэтая насадка называецца аэратарам, са значком на ўпакоўцы «эка 50 %». Ён прызначаны для зніжэння расходу вады за кошт змешвання яе з паветрам. Калі пры звычайных умовах праз цалкам адкрыты кран кожную хвіліну выцякае каля 15 літраў вады, то з аэратарам яе расход зніжаецца да 6—8 літраў у хвіліну, і напор пры гэтым не зніжаецца. Мы праверылі на практыцы: ваду эканоміць, хай не на 50, але на 30 працэнтаў дык дакладна!

Я стала больш карыстацца не хімічнымі, а натуральнымі сродкамі для чысткі — содай, лімонам, воцатам. Напрыклад, можна капнуць воцатам на патэльню, дадаць крыху вады і паставіць на агонь — і ўсе пахі ад прыгатавання ежы сыдуць з кухні. Паветра стане чыстае.

Яшчэ я даведалася, што ёсць такія пластыкавыя бутэлькі, якія можна выкарыстоўваць толькі адзін раз. Паўторна ў іх нічога нельга наліваць — ні соку, ні варэння. Гэта можа шкодна адбіцца на здароўі.

Я цяпер ведаю, як правільна выбіраць электрапрыборы, на што звяртаць увагу. Так, трэба абавязкова ўлічваць іх энергаспажыванне. Гэта асабліва важна пры куплі халадзільніка, бо ён традыцыйна цягне шмат электрычнасці. Таксама для мяне аказалася адкрыццём, што пасудамыйная машына моцна эканоміць ваду, эканомія можа даходзіць да 40 %! За яе дорага плаціш, калі купляеш, але потым яна пачынае эканоміць ваду і, адпаведна, нашы грошы таксама.

І я зараз імкнуся як мага радзей карыстацца поліэтыленавымі пакетамі, бо іх цяжка ўтылізаваць. Хаджу ў краму з палатнянай шматразовай торбай. У Савецкім Саюзе да 90-х гадоў выраблялася менш за ўсё бытавога смецця, таму што мы выкарыстоўвалі шкляныя бутэлькі і шматразовыя сеткі і сумкі замест пластыкавых. Зараз, дарэчы, на Захадзе вяртаюцца да гэтага.

Яшчэ мяне вельмі ўразіла інфармацыя пра пластмасавыя кветкі, якія мы носім на могілкі. Нідзе ў свеце так ніхто не робіць, гэта забаронена! А ў нас гэта ўжо стала бізнесам, але гэтыя штучныя кветкі вельмі моцна шкодзяць экалогіі. Яны вылучаюць шмат атрутных рэчываў у паветра і глебу і пазней ператвараюцца ў атрутныя адходы, якія прырода сама не здольная абясшкодзіць і ўтылізаваць. Так што лепш ушанаваць памяць блізкіх людзей жывымі кветкамі, як гэта робяць у іншых краінах.

Ведаеце, калі ўносіш нават самы невялікі ўклад у тое, каб захаваць прыроду, з'яўляецца пачуццё радасці. Мы ж разумеем, што пасля нас застаюцца нашы дзеці і ўнукі.

«Я правяла энергааўдыт свайго дома і ўнесла шмат змен у кватэру...»

Нона Буко:

— Я пачала вывучаць пытанні эканоміі рэсурсаў яшчэ ў 2013 годзе, у Школе энергазберажэння, якая праводзілася ў экалагічнай гімназіі № 19. «Экалогія і Я» — працяг той «школы». Вельмі многія веды я ўжываю на практыцы. Так, правяла энергааўдыт свайго дома і ўнесла шмат змен у кватэру.

Напрыклад, я памяняла лямпачкі напальвання на энергазберагальныя, якія расходуюць электрычнасці ў пяць разоў менш. Але энергазберагальныя лямпачкі няма сэнсу ўкручваць ў прыбіральні або ў кладоўцы — іх трэба выкарыстоўваць у тых пакоях, дзе доўга знаходзіцеся. Яшчэ значна эканомней выкарыстоўваць мясцовае асвятленне, а не агульнае. Напрыклад, пры праглядзе тэлевізара замест лямпачкі ўверсе лепш уключыць настольную лямпу або бра...

У нас у кватэры газавая пліта, таму мы ніколі не карыстаемся электрачайнікам — ён таксама расходуе шмат электраэнергіі. А ў чайнік, які ставім на пліту, наліваем такую колькасць вады, якая трэба зараз, каб не марнаваць шмат газу пры кіпячэнні лішняй вады. Стараемся своечасова размарожваць халадзільнік...

Мы прыбралі ў кватэры ўсё шчыльныя шторы, і цяпер у нас больш святла і цяпла. Бо нават не вельмі яркае зімовае сонца можа абагрэць пакой з паўднёвага боку, калі акно без штор.

Батарэі ў кватэры мы пафарбавалі ў цёмны колер: гладкія, цёмныя батарэі аддаюць на 5—10 % больш цяпла, чым белыя. І калі ў кватэры ўсё ж халаднавата, лепш не ўключаць абагравальнік, а цяплей адзецца. Адзін лёгкі ваўняны жакет можа сэканоміць вам ад 15 да 25 % энергіі на абаграванне кватэры.

Вось такім чынам мы ў сваёй сям'і эканомім уласныя грошы і грошы сваёй краіны. Хачу сказаць, што наша пакаленне, якое жыло пры Савецкім Саюзе, не мае ніякага паняцця аб эканоміі рэсурсаў. І толькі ў апошні час, калі сталі расці кошты на паслугі ЖКГ, людзі сталі задумвацца пра гэта. А вось за мяжой усё не так. Мы з дачкой былі ў Іспаніі, дык там гаспадары кватэры, дзе мы жылі, забяспечаная сям'я, між іншым, ніколі не будуць мыць рэчы ў машыне, калі яна не запоўненая да самага верху. А ў нас многія ўсё яшчэ могуць кінуць адну кашулю і мыць яе цэлую гадзіну... І душ іспанцы прымаюць не так, як мы. Яны ў яго куляй залятаюць і вылятаюць праз некалькі хвілін — эканомяць ваду...

Святлана БУСЬКО.
busko@zviazda.by

■

❍ Дарэчы

Папярэджанне вучоных свету чалавецтву

Нядаўна 15 тысяч навукоўцаў з 184 краін падпісалі «Папярэджанне вучоных свету чалавецтву: другое апавяшчэнне».

Гэта публікацыя стала другім пасланнем такога роду. Першае «Папярэджанне вучоных свету чалавецтву» было апублікавана ў 1992 годзе, тады яго падпісалі 1700 спецыялістаў.

Аўтары сцвярджаюць: тэндэнцыі апошніх 25 гадоў кажуць пра тое, што чалавецтва працягвае рызыкаваць сваёй будучыняй.

Вось што пагоршылася за апошнія 25 гадоў:

— колькасць прэснай вады на душу насельніцтва скарацілася на 26 %;

— знізіліся ўловы дзікай рыбы, нягледзячы на меры па іх павышэнні;

— колькасць «мёртвых» зон акіяна павялічылася на 75 %;

— страчана 1,2 мільёна квадратных кіламетраў лясных угоддзяў, большую частку якіх перапрацавалі для выкарыстання ў сельскай гаспадарцы;

— прадоўжыўся значны рост глабальных выкідаў вугляроду і сярэдніх тэмператур;

— насельніцтва планеты вырасла на 35 %;

— колькасць млекакормячых, рэптылій, амфібій, птушак і рыб скарацілася на 29 %.

Навукоўцы ўпэўненыя, што гэта не фальшывая трывога. Яны канстатуюць, што чалавецтва рухаецца па вельмі няўстойлівым шляху.

■ Здарэнне

Міма страхавочнай сеткі

Расійская паветраная гімнастка Юлія Цікаева атрымала сур'ёзныя траўмы падчас выступлення ў гомельскім цырку. Яна сарвалася з вышыні прыкладна ў чатыры метры — міма страхавочнай сеткі непасрэдна на манеж, уніз тварам.

Гэта быў першы нумар вячэрняй праграмы 5 студзеня. Дваццацігадовая артыстка з маскоўскага калектыву Алішэра Аліева выступала ў праграме «Партэрны палёт» у межах навагодняй праграмы «Дзед Мароз і львы Афрыкі».

У нядзелю ў інтэрнэце з'явілася аматарскае відэа падзення. З яго зразумела, што спачатку выкананне трука ішло нармальна, але ў адзін з момантаў лавітар не змог утрымаць дзяўчыну і яна выслізнула ў яго з рук. Гімнастка зачапіла край сеткі і звалілася на арэну.

Дзяўчыну шпіталізавалі ў рэанімацыю абласной клінічнай бальніцы. Гомельскія гледачы перажываюць з нагоды выпадку і жадаюць Юліі выздараўлення. На старонцы гомельскага цырка ў адной з сацыяльных сетак у адказ на занепакоеныя пытанні гледачоў з'явілася паведамленне: «Усім шчыры дзякуй за турботу!!! Юля па-ранейшаму пад пільным назіраннем урачоў. Пераломаў няма. Ёсць гематома галавы, але ўрачы кажуць, што пакуль хірургічнае ўмяшанне не патрабуецца. Якім будзе самаадчуванне далей, пакажа толькі час. Мы ўсе трымаем за яе кулачкі! Яшчэ раз усім дзякуй за неабыякавасць!»

Як паведаміла афіцыйны прадстаўнік УСК па Гомельскай вобласці Марыя Крываногава, праверку па факце траўмавання паветранай гімнасткі праводзіць Гомельскі гарадскі аддзел СК. Падчас яе будзе праверана выкананне тэхнікі бяспекі пры дэманстрацыі трукаў. Таксама ініцыявана правядзенне спецыяльнага расследавання абласным дэпартаментам дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацабароны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

■

Уведомление о завершении передачи обязательств

Закрытое акционерное страховое общество «Аснова страхование» на основании пункта 27 Положения о порядке передачи страховой организацией обязательств, принятых по договорам добровольного страхования, страховых резервов и остатков средств фондов предупредительных (превентивных) мероприятий другой страховой организации, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь 04.11.2006 года № 1462 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 25.08.2006 № 530», уведомляет о завершении **28 декабря 2017 года** передачи обязательств ЗАСО «Аснова страхование», вытекающих из заключенных договоров добровольного страхования, страховой организации ЗАСО «Белнефтестрах».

Права и обязанности, вытекающие из договоров страхования, обязательства по которым переданы, переходят к ЗАСО «Белнефтестрах» **с 28 декабря 2017 года.**

УНП 806000245

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»

Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 201/С-13039 наименование – жилой дом, назначение – здание одноквартирного жилого дома, площадью 43,8 кв. м по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Стодолищенский с/с, д. Улишицы, ул. Северная, д. 8, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 221880420101000045 площадью 0,2500 га. Составные части и принадлежности: сени, восемь сараев, уборная, навес, крыльцо. **Нач. цена:** 3 510 рублей. **Задаток:** 351 руб.

Условия: 1. Участник аукциона, ставший победителем, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона; возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. 2. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект (Объекты) недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь. 3. На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **www.marketvit.by**. Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга». При оформлении лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет: копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица и его паспорт; паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенная доверенность для представителя физического лица; копию платежного документа, подтверждающего внесение в установленном порядке задатка в размере 10 % от начальной цены продажи; организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе; документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на русский или белорусский языки; представителями организаций – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Аукцион состоится 12.02.2018 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** в рабочие дни с 09.01.2018 с 8.30 по 09.02.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 7). **Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by**

Скіп'ёўскі лес і Бушылаўская крынічка Кузьмы Чорнага

Рэдкае Слуцкае Евангелле – каштоўны экспанат.

Дырэктар музея Людміла НІЖЭВІЧ — пра славутага земляка

Даўно марыла пабываць у Літаратурным музеі Кузьмы Чорнага, што ў вёсцы Цімкавічы Капыльскага раёна. Такая магчымасць надарылася падчас чарговай камандзіроўкі.

— Музей пабудаваны ў 1962 годзе настаўнікамі і вучнямі Цімкавіцкай сярэдняй школы пад кіраўніцтвам былога дырэктара школы, заслужанай настаўніцы БССР Зінаіды Раманенкі, — расказала дырэктар установы Людміла Ніжэвіч. — Спачатку ён быў школьны, а ў 1993 годзе яму нададзены статус дзяржаўнага і створана новая экспазіцыя. Яна размешчана ў пяці залах і ўсебакова раскрывае творчую асобу Кузьмы Чорнага — празаіка, публіцыста, драматурга, памфлетыста.

Да 110-годдзя класіка быў праведзены фотапленэр, вынікам якога стала фотавыстаўка «Родныя мае мясціны...», якая арганічна ўпісалася ў агульную канцэпцыю музея.

— Скіп'ёўскі лес. Любімы лес Мікалая Раманоўскага. Дарэчы, у апошнія гадзіны свайго жыцця Кузьма Чорны пісаў пра свой лес. Аповесць «Скіп'ёўскі лес» так і засталася незавершаная, — расказала Людміла Ніжэвіч. — Сюды маленькі Коля часта хадзіў са сваім дзедам Міхалам Парыбкам-Чорным, які расказваў і паказваў, як хвоі гамоняць, як паўзе жучок, як травінка да травінкі хіліцца. Адсюль у хлопчыка з дзяцінства любоў да прыроды, апісанне якой яму вельмі ўдавалася пазней у творах. Паводле ўспамінаў знакамітага паэта Міколы Хведаровіча, які таксама вучыўся ў Цімкавічах, разам з Мікалаем у цёплы вясновы дзень спускаліся яны ўздоўж Радзівілаўскага парку да рачулкі Мажы, садзіліся ў човен і плылі рыбачыць. Лавілася рыба ці не, а вялася размова, як цяжка жывецца простаму чалавеку.

На іншым фотаздымку Бушылаўская крынічка. Па дарозе ў Скіп'ёўскую царкву яны з маці тут прыпыняліся, каб адпачыць, напіцца вады. І гэтае месца для хлопчыка стала блізкае і дарагое. Дарэчы, і цяпер цімкаўляне бяруць тут ваду.

Кірмашовая плошча са званіцай, капліцай. Калісьці Мікалай любіў прыходзіць на рынак, што тут месціўся, размаўляў з землякамі, якія потым пазнавалі сябе ў яго творах.

— Кузьма Чорны рос і гадаваўся сярод простых людзей фізічнай працы, для якіх кавалак хлеба і палатняная кашуля адна на год лічыліся вялікім шчасцем. З гэтымі людзьмі ён быў звязаны ўсім сваім жыццём і творчасцю, — канстатуе Людміла Іосіфаўна. — На вуліцы Капыльскай захавалася хата, якая таксама звязаная з жыццём будучага пісьменніка. Мікола добра вучыўся, і настаўнік рыхтаваў яго да паступлення ў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. Маці, сабіраючы сына ў дарогу, паклала ў дзежачку гуркі, хлеб і кавалачак сала, якое пазычыла ў сваіх суседзяў Касікоўскіх.

— У музеі зроблены экспазіцыйны комплекс вясковай хаты. Нарадзіўся будучы пісьменнік у Борках, але там школы не было. А маці вельмі хацела, каб сын вучыўся. Калі Колю споўнілася восем гадоў, сям'я пераехала ў мястэчка Цімкавічы і сын пайшоў у двухкласнае вучылішча. Вось так выглядала хата, дзе жыў маленькі Мікалай, — паказвае Людміла Ніжэвіч. — Цімкавічы — былое ткацкае мястэчка. Многія не ведаюць, але раней ткачамі былі толькі мужчыны.

Людміла НІЖЭВІЧ спяшаецца на работу.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

І дзяды Кузьмы Чорнага былі ткачамі, і бацька. Выдатна ткала і маці. На стале ляжыць абрус, вытканы яе рукамі.

Галоўны атрыбут экспазіцыі гэтай залы — кросны. Бадай, што ў кожным этнаграфічным музеі ёсць яны. Аднак адрозненне музея Кузьмы Чорнага ў тым, што тут любы ахвотны можа паспрабаваць саткаць свой радок і такім чынам пакінуць памяць аб сабе.

— Канвой мастацкага афармлення залаў сталі малюнкі пісьменніка, якія арганічна спалучаюцца з дакументальнай часткай экспазіцыі і дапамагаюць эмацыянальна раскрыць свет перажыванняў аўтара, — працягвае мая суразмоўца. — У залах музея можна ўбачыць асабістыя рэчы Кузьмы Чорнага, фотаздымкі з сямейнага альбома, яго рукапісы і кнігі на розных мовах свету, прачытаць радкі з дзённіка, а таксама пачуць яго голас, зафіксаваны на магнітнай стужцы.

Пісьменніцкае пасведчанне Кузьмы Чорнага, падпісанае Максімам Горкім.

У музеі сабраны не толькі матэрыялы з жыцця сусветна вядомага пісьменніка, але і сведчанні яго багатай творчай спадчыны. Артыкул, упершыню падпісаны псеўданімам К. Чорны — «На граніцы» 1923 года, першыя «маладнякоўскія» зборнікі, фотаздымкі з аб'яднання «Узвышша». Тут жа можна прачытаць артыкулы і рэцэнзіі літаратурных крытыкаў на яго творы. Таксама раскрываецца Кузьма Чорны як перакладчык. Менавіта ён перакладаў літаратурныя творы з рускай і польскай моў на беларускую для тэатра. Кузьма Чорны любіў тэатр, удзельнічаў у драматычным гуртку. Напісаная ім п'еса «Бацькаўшчына» з поспехам ішла ў тэатры імя Янкі Купалы і атрымала шмат добрых водгукаў і рэцэнзій. Станоўча адзначылі п'есу і ў Маскве падчас гастроляў тэатра. Галоўнага героя Леапольда Гушку выконваў Уладзімір Уладамірскі.

Для папулярызацыі твораў Кузьмы Чорнага пры музеі працуе тэатральная студыя «Іскрынка». Яе ўдзельнікі — людзі самых розных узростаў і прафесій — ад рабочых да работнікаў культуры. З задавальненнем у пастаноўках удзельнічаюць моладзь, дзеці. Былі пастаўлены інсцэніраваныя апавяданні Кузьмы Чорнага «Маё дзела цялячае», «Родныя мясціны», аповесць «Насцечка», артыкул «У роднай глушы», п'еса «Базылевічава сям'я». І тут Людміла Ніжэвіч выступае ў многіх іпастасях: і рэжысёр, і сцэнарыст, і касцюмер, і музычны афарміцель. Калі хтосьці не трапіў на спектакль, то яму прапануюць паглядзець у відэазапісе тэатральныя пастаноўкі. У планах — дэманстрацыя мастацкіх стужак, знятых па творах Кузьмы Чорнага. Акрамя таго, пры музеі дзейнічае тэатр фланелеграфіі «Скарбонка прыгажосці», які ставіць казкі для выхаванцаў дзіцячага сада і вучняў малодшых і сярэдніх класаў.

Вядома, наведвальнікі музея цяпер патрабавальныя, іх не здзівіш пастаяннай экспазіцыяй, яны патрабуюць эксклюзіву. Для таго каб прыцягнуць людзей, Людміла Ніжэвіч уводзіць у работу ўстановы інтэрактыўныя элементы.

Напрыклад, на выставе «Мора шуміць» можна намаляваць на марскім пяску прыдуманыя вобразы, паглядзець марскія ракавінкі з шасці мораў. Людміла Іосіфаўна наладзіла музейныя заняткі па ёй, якія з задавальненнем наведваюць усе ахвотныя.

Зараз дзейнічае вельмі цікавая рэтра-выстаўка «Забытыя механізмы», дзе можна ўбачыць рэчы 1920—2000 гадоў: фунтавы бязмен, каляровы ліхтарык, радыёлу з вінілавымі пласцінкамі, комплекс для фотасправы, бабінны і касетны магнітафоны, светлавую ўстаноўку і шмат іншага. Дарэчы, усё ў рабочым стане і наведвальнікам уключаецца паслухаць.

— Выстава цікавая для ўсіх узростаў. Так што запрашаю яе наведаць. І хочацца падзякаваць усім гаспадарам рэчаў, якія перадалі іх музею, асабліва Віктару Лопуху, — сказала Людміла Іосіфаўна.

Музей — гэта культурны і асветніцкі цэнтр, дзе ладзіцца шмат пазнавальных мерапрыемстваў. Гэта музейна-педагагічныя заняткі ў межах праграмы «Ганарыся сваім земляком і ведай пра яго», «Наша спадчына», «Музей і дзеці», сустрэчы з пісьменнікамі, акцыі з работнікамі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Дзяржаўнай аўтаінспекцыі, чыгункі, настаяцелем царквы Мікалая Цудатворца, вечарыны, выставы беларускіх пісьменнікаў, музейныя святы. А 22 лістапада штогод у музеі праходзіць Дзень ушанавання памяці Кузьмы Чорнага.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

Извещение о проведении первого и повторного открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка
Лот №1. Земельный участок с кадастровым № 221280603601000065, площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, п. Витьба, ул. Шоссейная, 16 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 1 735,92 бел. руб. **Размер задатка:** 173,59 бел. руб.
Дата, время и место проведения аукциона: 09.02.2018 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 09.01.2018 с 8.30 по 08.02.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY23AKBB36003140100360000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Бабиничский сельсовет). **Условия аукциона:** обратиться в РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру» в уст. порядке за гос. регистрацией прав на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона; получить в отделе архитектуры и строительства Витебского райисполкома в уст. порядке тех. документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию зем. участка в течение 1 года со дня гос. регистрации создания зем. участка и возникновения права на него; осуществить строительство жилого дома в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка
Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 221586004601000019, площадью 0,2500 га по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, Псуевский с/с, д. Заозерная, ул. Драчинская, 10 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Долгое), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В. **Нач. цена**: 2 000 руб. **Размер задатка:** 200 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY15AKBB36003151165220000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Псуевский сельсовет)
Лот № 2. Земельный участок с кадастровым №221584208101000147, площадью 0,1033 га по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, Обрубский с/с, д.Хорошки, ул.Солнечная, 7 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р.Аржаница, оз.Кривое-2, оз.Белое-4, оз.Чечелевское). **Нач.цена**: 1 200 руб. **Задаток:** 120 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY48AKBB36003150665260000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Обрубский сельсовет)
Дата, время и место проведения повторного аукциона: 24.01.2018 в 12.00 по адресу: Витебская обл., г. Глубокое, ул. Ленина, 42, в Глубокском райисполкоме. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 09.01.2018 с 8.30 по 23.01.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Условия аукциона: по лоту 1:** осуществить в двухмесячный срок со дня утверждения протокола аукциона гос. регистрацию прав, ограничений прав на зем. участок; получить в установленном порядке проектную документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома; приступить к занятию зем. участка не позднее 1 года после гос. регистрации создания зем. участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления; после получения разрешения на строительство одноквартирного жилого дома снять на земельном участке плодородный слой почвы из-под пятен застройки и использовать его для благоустройства участка; **по лоту 2:** осуществить в течение 2 месяцев со дня утверждения протокола аукциона гос. регистрацию прав, ограничений (обременений) прав на зем. участок; получить в уст. порядке проектную документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома; приступить к занятию зем. участка не позднее 1 года после гос. регистрации создания зем. участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления; после получения разрешения на строительство одноквартирного жилого дома снять на зем.участке плодородный слой почвы из-под пятен застройки и использовать его для благоустройства участка

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

Извещение о реализации недвижимого имущества ОАО «Барановичидрев», имеющего высокий износ

Вторые повторные торги состояться 19 января 2018 года, в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.

Цена всех Лотов №№ 8-13 установлена ликвидационной комиссией и снижена на 50% от первоначальной цены.

Сумма задатка: 10% от начальной цены Лотов в рублях РБ.

Получатель платежа: 225410, ОАО «Барановичидрев», г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, р/с: BY68BPSB30121226161389330000; БИК BPSBBY2X в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск; УНН 200299909.

Назначение платежа-задаток за участие в аукционе.

Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению.

Заявление на участие в аукционе направляется лицами, желающими принять участие в аукционе, по ЛОТАМ в срок до 14.00 16.01.2018 года организатору торгов – председателю ликвидационной комиссии Мищуку А. М. по адресу:

225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. ВОСТОЧНЫЙ ПОСЕЛОК, 3, ОАО «Барановичидрев».

Конт. тел.: 8 029 6332490 vel.; (029) 8248026 МТС; факс (0163) 455124;

emal: **mischuk_am@mail.ru**

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистраций.

Более подробно с условиями аукциона можно ознакомиться на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 08.01.2018 года

ЗАСО «Промтрансинвест» предлагает принять участие в процедуре закупки № 2017-522629, размещенной на сайте http://www.icetrade.by, по «Металлы/металлоизделия > Металлоизделия – другое».

УНП 100357923

■ Спорт-тайм

Чэмпіён трымае планку

У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра перамогу Антона Кушніра на этапе Кубка свету ў Маскве, пра вынікі чарговага біятлоннага этапу ў Германіі і пра новага трэнера БАТЭ.

1. У Маскве адбыўся этап Кубка свету па фрыстайле. Антон Кушнір атрымаў ацэнку 126,55 бала і заняў першае месца. Расіянін Ілья Бураў, які стаў другім, прайграў беларусу 0,76. Максім Гусцік стаў чацвёртым, Станіслаў Гладчанка замкнуў шасцёрку наймацнейшых, Дзяніс Осіпаў стаў 11-м, Дзмітрый Мазуркевіч аказаўся на 19-м радку сярод 32 удзельнікаў.

У жаночых спаборніцтвах усе тры беларускія спартсменкі прабіліся ў шасцёрку суперфіналістак. Найлепшай сярод нашых спартсменак стала Аляксандра Раманоўская, якая заняла 2-е месца. Ганна Гуськова стала чацвёртай, Ала Цупер паказала 5-ы вынік.

У мужчынскім заліку Кубка свету па выніках трох этапаў Антон Кушнір з 164 ачкамі падняўся на 2-е месца, Максім Гусцік займае 3-ю пазіцыю, Станіслаў Гладчанка — 7-ю, Дзяніс Восіпаў — 12-ю, Дзмітрый Мазуркевіч — 23-ю, Арцём Башлакоў — 28-ю.

Жаночы залік Кубка свету ў лыжнай акрабатыцы ўзначаліла Ганна Гуськова (186 ачкоў), на трэці радок падняласа Аляксандра Раманоўская, Ала Цупер размясцілася на сёмым радку.

У праграме сёлетняга Кубка свету яшчэ тры этапы — у амерыканскіх Дзір-Вэлі (12 студзеня) і Лэйк-Плэсідзе (18 студзеня і 19 студзеня).

2. Эстафетнымі гонкамі завяршыўся чарговы этап Кубка свету па біятлоне ў нямецкім Аберхофе. Нашы біятланісткі ў складзе Надзеі Скардзіна, Надзеі Пісаравай, Дзінары Алімбекавай і Дар'і Домрачавай занялі 15-е месца. Пасля двух этапаў яны былі дзявятымі, а затым здарыўся правал на стрэльбішчы, і ў выніку на апошнім крузе наша каманда была знятая з гонкі.

Перамогу атрымала зборная Францыі.

Мужчынская зборная ў складзе Уладзіміра Чапеліна, Сяргея Бачарнікава, Максіма Вераб'я і Рамана Ялётнага стала 24-й сярод 25 камандаў.

3. Аляксандра Сасновіч саступіла ўкраінцы Эліне Світолінай у вырашальным матчы турніру катэгорыі «Прэм'ер» у Брысбене (прызавы фонд — $894,7 тыс.). Лік у матчы — 2:6, 1:6.

— Прабачце за маю гульню сёння, — сказала Аляксандра падчас цырымоніі ўзнагароджання фіналістаў. — Дзякуй балельшчыкам з Беларусі, якія падтрымлівалі мяне на працягу ўсяго турніру. Яны сачылі за мной па тэлевізары.

Дзякуючы паспяховаму выступленню ў Брысбене з новага тыдня Сасновіч дасталося званне першай ракеткі Беларусі і 53-е месца ў рэйтынгу WTA. Арына Сабаленка стала 69-й.

4. Прэс-служба БАТЭ абвясціла аб падпісанні кантракта з новым галоўным трэнерам, якім стаў беларускі спецыяліст Алег Дулуб, які да нядаўняга часу працаваў ва ўкраінскай прэм'ер-лізе.

Алег Дулуб нарадзіўся 20 верасня 1965 года ў Калінкавічах. Выступаў на пазіцыях паўабаронцы і нападаючага. Пасля завяршэння гульнявой кар'еры перайшоў на трэнерскую работу. Спачатку ўзначальваў дзяржынскую «Лівадыю» (2001—2003 гады). Потым працаваў трэнерам дублюючага складу «Дарыды» з Мінскага раёна (2004), юнацкай каманды «Змена-Мінск» (2005), сталічнай «Змены-2» (2006), жодзінскага «Тарпеда» (2007—2009), «Мінска» (2010), «Віцебска» (2011), «Гомеля» (2012), гродзенскага «Нёмана» (з красавіка па чэрвень 2013 года), сталічнага «Дынама» (з чэрвеня 2013 па лістапад 2014 года). У маі 2015 года ўзначаліў мінскія «Крумкачы» і вывеў іх з першай лігі ў вышэйшую (працаваў да кастрычніка 2016-га). Пасля працаваў галоўным трэнерам украінскіх «Карпат» з Львова (з кастрычніка 2016-га да чэрвеня 2017-га) і «Чарнаморца» з Адэсы (з верасня да снежня 2017 года).

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.25	17.09	7.44
Віцебск —	9.25	17.09	7.44
Магілёў —	9.15	16.59	7.44
Гомель —	9.04	17.03	7.59
Гродна —	9.39	17.26	7.47
Брэст —	9.32	17.34	8.02

Месяц

Апошняя квадра ў 1.25. Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Сцяпана, Фёдара.*
К. *Аліцыі, Тэрэзы, Адрыяна, Антонія, Юльяна.*

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

9 СТУДЗЕНЯ

У краіне

1909 год — нарадзілася (в. Серкавіцы, цяпер у Талачынскім раёне) Марыя Барысаўна Осіпава, удзельніца Мінскага антыфашысцкага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1943). Была сувязной партызанскага атрада Нікіціна, «Дзіма», «Мясцовых», брыгады «Дзядзькі Колі». Арганізоўвала выратаванне, забеспячэнне дакументамі і адпраўку ў партызанскія атрады савецкіх ваеннапалонных, вязняў гета, дастаўку партызанам зброі і боепрыпасаў. Адна з арганізатараў знішчэння нямецка-фашысцкага генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ. Памерла ў 1999 годзе.

1919 год — пачалося выданне газеты «Весткі Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі» (выдавалася ў Мінску да лютага 1919 года на беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай мовах).

1953 год — нарадзіўся (г. Баранавічы) Уладзімір Яўгенавіч Солтан, беларускі кампазітар. Сярод твораў: опера «Дзікае паляванне караля Стаха» паводле аповесці У. Караткевіча, дзве сімфоніі, два канцэрты для віяланчэлі з аркестрам, лірычная кантата «Мая Беларусь» і іншыя. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 1997 годзе.

1769 год — у Расіі па ўказе Кацярыны II у абарачэнне ўвайшлі першыя папяровыя грошы пад найменнем «асігнацыя» — папярэдніца сучаснага рубля.

У свеце

1890 год — нарадзіўся Карал Чапек, чэшскі пісьменнік. Найлепшым творам Чапека лічыцца раман «Вайна з саламандрамі», антыфашысцкая антыўтопія, напісаная ў 1936 годзе. Пазнаўшы ў Вярхоўным Саламандры сябе, Гітлер абвясціў пісьменніка сваім асабістым ворагам. Іншыя вядомыя творы Карала Чапека — «Сродак Макрапуласа», «Фабрыка Абсалюту», «Кракаціт». Ужо пры жыцці Карал Чапек стаў вядомы не толькі ў Чэхаславакіі, але і ў іншых краінах. Ён быў намінантам на Нобелеўскую прэмію 1936 года па літаратуры, заснаваў Чэхаславацкі Пэн-клуб, быў членам Камітэта Лігі Нацый па літаратуры і мастацтве. Памёр Карал Чапек у Празе 25 снежня 1938 года, незадоўга да поўнай фашысцкай акупацыі Чэхаславакіі. Яго ўдава захавала архіў пісьменніка, закапаўшы яго ў прыгарадзе Прагі.

1951 год — афіцыйна адкрыты будынак штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку. Будынкі размясціліся ва ўсходняй частцы Манхэтэна паміж 42-й і 48-й вуліцамі, Першай авеню і пралівам Іст-Рывер. На тое, каб спраектаваць на ўчастку плошчай 7 га будынак Арганізацыі Аб'яднаных Нацый вышынёй больш за 167 м, групе архітэктараў спатрэбіліся шэсць гадоў. Хоць геаграфічна штаб-кватэра ААН размешчана ў Нью-Ёрку, яна мае статус міжнароднай зоны.

УСМІХНЕМСЯ

Размова двух салдат:

— Слухай, а як ты даведаўся, што ты муляр?

— Ну як. Маёр падышоў і сказаў: «Ты — муляр!»

Сані Дзеда Мароза можна лёгка адрозніць ад саней Санта-Клауса па ўстаноўленым на іх відэарэгістратары.

— Дзе ж той мужчына, які будзе кахаць мяне такой, якая я ёсць?

— Я тут!

— Не, ты бедны.

Касірка ў супермаркеце была такой сумнай, што я ўзяў усё — і пакет, і налепку, і бляшанку кавы па акцыі.

— Вы любіце плаваць?

— Так.

— А якому стылю аддаяце перавагу, кролю або брасу?

— Матрацу.

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ ТЭЛ./ФАКС: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 241. Нумар падпісаны ў 19.30 8 студзеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12